Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка

НА БІТВУ З СІЛАЙ ЦЁМНАЮ, З ПРАКЛЯТАЮ АРДОЙ

Напярадзе—камуністы

То была барацьба, у якой ні сотні, ні нават тысячы людзей, а ўвесь народ заслужыў славу героя. То была Вялікая Айчынная вайна. І ў яе легендарным летапісу нямала яркіх старонак па праву належаць усенароднай партызанскай барацьбе ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Асабліва шырокі размах партызанскі рух атрымаў у Беларусі. На яе часова акупіраванай тэрыторыі дзейнічала звыш 1.100 партызанскіх атрадаў. У радах «лясных салдат» змагаліся больш як 370 тысяч байцоў. Яны атрымлівалі актыўную дапамогу і падтрымку ўсяго насельніцтва акупіраванай Беларусі. Каля 400 тысяч чалавек налічваў партызанскі рэзерв. У яго ўваходзілі людзі, якія пры неабходнасці маглі быць мабілізаваны, пастаўлены пад ружжо на працягу адной ночы.

Натхняльнікам і арганізатарам партызанскай барацьбы з'явілася Кампартыя Беларусі, слаўны баявы атрад ленінскай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. З першых дзён вайны Цэнтральны Камітэт КПБ, выконваючы Дырэктывы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб барацьбе з акупантамі, праводзіў велізарную работу па разгортванню масавага партызанскага руху ў тыле германскіх войск. Яго ініцыятарамі выступалі ў першую чаргу камуністы, камсамольцы, савецкія патрыёты з ліку перадавых рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі.

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 10 падпольных абкомаў партыі, 185 міжраённых, гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, пярвічных партыйных арганізацый. У іх саставе было звыш 25 тысяч камуністаў.

Актыўным памочнікам партыі па мабілізацыі на барацьбу з акупантамі маладых савецкіх патрыётаў быў наш слаўны камсамол. Камсамольска-маладзёжнае падполле прадстаўлялі 10 абласных, 210 міжраённых, гарадскіх і раённых камітэтаў ЛКСМБ і звыш 5 тысяч пярвічных камсамольскіх арганізацый. Яны аб'ядноўвалі ў сваіх радах больш як 95 тысяч камсамольцаў.

Адным з першых у Беларусі пачалі актыўныя дзеянні партызанскія атрады М. Ф. Шмырова, Н. П. Пакроўскага, Т. П. Бумажкова, В. З. Коржа і іншыя. З невялікіх груп байцоў яны пазней ператварыліся ў буйныя партызанскія брыгады і злучэнні. У хуткім часе пасля свайго ўварвання на нашу зямлю вораг адчуў на сабе іх раптоўныя і магутныя ўдары. Напрыклад, партызаны з атрада Бумажкова ўжо ў ліпені 1941 года смелым і нечаканым ударам разгромілі ў Бабруйскім раёне штаб буйной воінскай часці ворага, захапілі 35 аўтамашын, шмат матацыклаў і веласіпедаў, 8 кулямётаў. Гэтай аперацыяй кіраваў Ф. І. Паўлоўскі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 жніўня 1941 года Т. П Бумажкову і Ф. І. Паўлоўскаму — першым з партызан Вялікай Айчыннай вайны — было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Партызанскі атрад Бацькі Міная (М. Ф Шмырова) да вясны 1942 года ўжо з'яўляўся грознай сілай. Ён меў да таго часу на баявым рахунку 1.300 знішчаных гітлераўскіх салдат, 60 афіцэраў, аднаго генерала, 200 паліцаяў і старастаў, 50 аўтамашын з жывой сілай і тэхнікай, адну бронемашыну, 50 масцоў.



Пінскае злучэнне партызанскіх атрадаў.

Байцы партызанскага атрада імя Суворава прымаюць прысягу.

У красавіку 1942 года на базе партызанскіх атрадаў Шмырова, Дзіка, Райцава, Біруліна была створана партызанская брыгада. Яна вызваліла рад населеных пунктаў і да канца верасня 1942 года ўтрымлівала так званыя «вароты» на лініі фронту Веліж—Усвяты. Праз гэтыя вароты партызанскія атрады забяспечваліся ўзбраеннем і боепрыпасамі. З «Вялікай зямлі» ў варожы тыл праходзілі спецыяльныя групы і атрады, а таксама кіраўнікі партыйнага і камсамольскага падполля. Гэта мела велізарнае значэнне для далейшага разгортвання і актывізацыі партызанскай барацьбы.

Выдатнымі справамі праславіў сябе слаўны сын беларускага народа Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў. У жніўні 1941 года паравознікі, якія былі эвакуіраваны з Оршы і працавалі ў дэпо імя Ільіча горада Масквы, па ініцыятыве К. С. Заслонава вырашылі стварыць свой партызанскі атрад для правядзення дыверсій на чыгуначным транспарце ў тыле ворага. У кастрычніку 1941 года ўзброеная група з 40 чалавек перайшла лінію фронту і прыбыла ў ваколіцы Оршы. Частка людзей засталася ў лясах, а астатнія на чале з Заслонавым уладкаваліся на работу ў Аршанскім дэпо. Дыверсійная група пад кіраўніцтвам свайго вопытнага важака вывела са строю 150 паравозаў. Калі ў лютым 1942 года над Заслонавым і яго таварышамі нависла пагроза арышту, яны пайшлі ў лес. Атрад Заслонава ў хуткім часе разрос ся ў буйную партызанскую брыгаду і смела граміў гітлераўскіх захопнікаў. Такіх прыкладаў было шмат.

Партызанскі рух у Беларусі не быў чымсьці разрозненым і адасобленым. Найбольш важныя аперацыі беларускіх партызан і падпольшчыкаў узгадняліся і праводзіліся ва ўзаемадзеянні з камандаваннем Савецкай Арміі, а таксама народнымі мсціўцамі суседніх рэспублік — Расійскай Федэрацыі, Украіны і Прыбалтыкі. З мэтай паляпшэння кіраўніцтва барацьбой беларускіх партызан па рашэнню Дзяржаўнага камітэта абароны ад 9 верасня 1942 года быў створан Беларускі штаб партызанскага руху. Яго начальнікам быў назначан сакратар ЦК КПБ(б) П. З. Калінін.

Беларускія партызаны атрымлівалі пастаянную дапамогу з «Вялікай зямлі». Была забяспечана рэгулярная дастаўка ў варожы тыл на самалётах узбраення і боепрыпасаў, медыкаментаў і адзення. Праз лінію фронту вывозілі раненых і хворых партызан.

Узняліся ўсе— ад малога да вялікага

Дзякуючы ўмеламу партыйнаму кіраўніцтву размах партызанскай барацьбы ў Беларусі з кожным днём шырыўся і нарастаў. Асабліва актывізавалася яна з вясны 1942 года. Паўсюдна на тэрыторыі акупіраваных раёнаў узнікалі новыя партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі. Народныя мсціўцы вялі гераічную барацьбу з захопнікамі, не давалі ім спакою ні ўдзень, ні ўначы. Толькі ў выніку «рэйкавай вайны» летам-восенню 1943 года і ў чэрвені 1944 года было падарвана звыш 363 тысяч рэек, што адпавядае 2270 кіламетрам аднакалейнага пуці, пушчана пад адхон некалькі тысяч варожых эшалонаў, узарвана вялікая колькасць мастоў, вадакачак і іншых збудаванняў.

Да восені 1943 года партызаны Беларусі вызвалілі 38 тысяч квадратных кіламетраў тэрыторыі. З'явіліся цэлыя «партызанскія краі», дзе дзейнічалі законы Савецкай улады. Народныя мсціўцы кантралявалі каля 60 працэнтаў акупіраванай тэрыторыі рэспублікі, займалі ў розны час звыш 20 раённых цэнтраў.

Партызанская эпапея багата прыкладамі масавага гераізму простых савецкіх людзей. Вось некаторыя з іх. У вёсцы Стары Двор Пастаўскага раёна фашысты расстралялі камуніста-падпольшчыка каваля Івана Міхненка. На змену бацьку сталі дзве яго дачкі: Рэгіна семнаццаці і Люда чатырнаццаці гадоў. Яны былі старэйшымі сярод пяцярых дзяцей Міхненка. Дзяўчынкі папрасілі прыняць іх у партызанскі атрад. У якасці першага баявога хрышчэння ім далі заданне — здабыць «языка» або ў крайнім выпадку прынесці з сабой дакументы забітага нямецкага афіцэра. Партызанкі свой выбар спынілі на каменданце мясцовага нямецкага гарнізона. Яны запрасілі нямецкага каменданта ў дом і, рызыкуючы жыццём сваім і сваіх родных не ўмеючы як трэба карыстацца пісталетам, усё-такі знішчылі фашыста і даставілі партызанскаму камандаванню каштоўныя дакументы і зброю ворага. Затым народнымі мсціўцамі сталі ўсе члены сям'і загінуўшага камуніста.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ў Крывіцкім раёне беспартыйны селянін Аляксандр Сямёнавіч Азончык (у партыю ўступіў у 1943 годзе) па сваёй ініцыятыве арганізаваў партызанскі атрад і кіраваў дыверсійна-тэрарыстычнымі аперацыямі супраць акупантаў. Ужо на 1 ліпеня 1941 года яго атрад складаўся з 66 чалавек. Азончык асабіста або ўдзельнічаючы ў аперацыях баявых груп, пусціў пад адхон 47 воінскіх эшалонаў з баявой тэхнікай і жывой сілай ворага, узарваў 4 чыгуначныя і 3 шасэйныя масты, спаліў 3 склады прадуктаў. У выніку ўсіх дыверсійных актаў, зробленых гэтым патрыётам, было забіта 1135 фашыстаў і больш як паўтары тысячы ранена. Аляксандр Сямёнавіч Азончык быў удастоен звання Героя Савецкага Саюза.

Гераічнае супраціўленне беларускага народа гітлераўскія захопнікі спрабавалі падавіць або хоць бы аслабіць нечуванымі зверствамі. Яны спальвалі цэлыя сёлы, пагалоўна расстрэльвалі і вешалі ні ў чым не вінаватых мірных жыхароў. Супраць партызан праводзіліся буйныя карныя экспедыцыі з удзелам адборных войск эсэсаўскіх часцей. Але гэтыя аперацыі не прыносілі жаданага выніку ворагу, партызаны давалі гітлераўцам рашучы адпор.

Народныя мсціўцы Беларусі аказалі велізарную дапамогу Савецкай Арміі ў разгроме нямецка-фашысцкіх полчышчаў. За тры гады партызанскай барацьбы яны вывелі са строю каля паўмільёна гітлераўскіх салдат і афіцэраў, пусцілі пад адхон 11128 варожых эшалонаў і 34 бронепаязды, знішчылі тысячы аўтамашын, танкаў, гармат, захапілі вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў.

Мужная барацьба беларускіх партызан высока ацэнена Савецкім урадам. Звыш 120 тысяч партызан і падпольшчыкаў Беларусі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, 87 праслаўленых народных мсціўцаў удастоены ганаровага звання Героя Савецкага Саюза.

Але якім бы значным ні быў уклад беларускіх партызан у справу разгрому ворага, беларусы добра разумеюць, што такі размах іх барацьбы і вызваленне іх рэспублікі сталі магчымымі толькі пры брацкай дапамозе ўсіх народаў Савецкага Саюза. Партызанскі рух быў сапраўды інтэрнацыянальным. У ім удзельнічалі прадстаўнікі 68 нацыянальнасцей — рускія, азербайджанцы, украінцы, грузіны, узбекі, армяне і многія іншыя нашы браты.

Розныя шляхі прывялі іх у лясы Беларусі: выхад з акружэння, уцёкі з канцлагера або палону. Нямала з іх было накіравана да партызан цераз лінію фронту. Але ўсіх іх у тыя цяжкія дні аб'ядноўвала вялікая мэта: выгнаць фашыстаў з нашай роднай савецкай зямлі, разграміць ворага, які зрабіў замах на свабоду і незалежнасць першай у свеце сацыялістычнай Айчыны працоўных. Сярод папулярных партызанскіх важакоў разам з беларусамі былі рускія А. І. Петракоў і А. В. Раманаў, украінцы І. М. Цімчук і Ф. Ф. Капуста, грузіны В. М. Талаквадзе і І. Г Шубіцідзе, армянін Х. А. Матэвасян, казах Г. Ахмедзьяраў, узбек М. Тамрогія іншыя.

Памяць аб героях свяшчэнная

Памяць аб героях свяшчэнная. Па добрай народнай традыцыі на месцах вялікіх бітваў савецкіх воінаў і партызан насыпаюцца Курганы вечнай славы. Паўсюдна ў Беларусі закладваюцца мемарыяльныя паркі, ствараюцца музеі і куткі баявой і працоўнай славы. На грамадскіх асновах у рэспубліцы арганізавана звыш трох тысяч музеяў, пакояў і куткоў славы. Столькі ж помнікаў, абеліскаў, мемарыяльных дошак і іншых памятных знакаў створана за апошнія два гады.

Па рашэнню Цэнтральнага Камітэта КПБ, у нашай рэспубліцы заведзена Кніга Народнай Славы. Рашэннем агульных сходаў працоўных таго ці іншага калектыву на яе старонкі заносяцца імёны патрыётаў, якія вызначыліся ў ратных і працоўных подзвігах. Такія Кнігі будуць мець усе працоўныя калектывы, раёны, гарады, вобласці.

Усё гэта накіравана на тое, каб аддаць належнае кожнаму подзвігу, кожнаму патрыёту, каб ні адзін з іх не быў забыты. У рэспубліцы многае робіцца для пошукаў імён і месц гібелі барацьбітоў. У гэтай рабоце асабліва актыўны ўдзел прымае моладзь, удзячная старэйшым пакаленням за нашу цудоўную Радзіму, у рэвалюцыі вызваленую, у бітвах выратаваную для патомкаў.

(БЕЛТА).

НА ЗДЫМКУ: селянін расказвае партызанам аб зверствах нямецка-фашысцкіх акупантаў.